

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская



№45 (178). 2 — 8 лістапада 2000г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 100 руб.

Прыйшла пара плаціць за электраэнергію

Канцэрн "Белэнерга" прыняў рашэнне абмежаваць у карыстанні электрычнасцю ўсіх неплацельшчыкаў да "аварыйнай брані", што маюць запазычанасць за ўжытую электраэнергію са студзеня да лістапада 2000 года.

Гэта значыць, з 1 лістапада на тых прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія своечасова не плоцяць за электраэнергію, будзе адключацца святло. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведаміла намеснік начальніка Слонімскіх раённых электрасетак Ганна Армяноўская.

Ганна Сяргееўна, у прыватнасці, сказала, што запазычанасць па калгасах і саўгасах Слонімскага раёна са студзеня месяца склала 617 мільёнаў рублёў. Сярод неплацельшчыкаў за святло лідзіруюць саўгас "Слонімскі", які павінен 127 мільёнаў рублёў, саўгас "Уперад" — 96,5 мільёна, калгас "Кастрычнік" — 107,2 мільёна рублёў.

Ёсць неплацельшчыкі і ў Слоніме — гэта 34 прадпрыемствы і арганізацыі. Больш за ўсё за святло павінны Слонімскі рэтранслятар — 46,5 мільёна рублёў, ваенведамства — 50 мільёнаў, камбікормавы завод — 11,5 мільёна, фабрыка пер'е-пуховых вырабаў — 5,3 мільёна, раённы аддзел адукацыі — 2,5 мільёна рублёў. Па словах Ганны Армяноўскай, на гэтых і іншых прадпрыемствах будзе адключацца святло.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЛЮДИ УСТАЛИ ЖДАТЬ



Фота Віталя Гіля

Когда в нашу редакцию звонят люди с просьбой решить какую-нибудь проблему, у меня возникает двоякое чувство. С одной стороны, приятно осознавать, что многие доверяют нашей газете. Но, когда я слышу: "Нигде правды не добиться. Вы — последняя инстанция", — мне становится обидно за всех нас. Как все-таки неприятно чувствовать себя незащищенным и разувериться во всем...

На днях в "ГС" в очередной раз позвонили. "Вас из деревни Масиловичи беспокоят. У нас вот какая проблема..." Далее звонившие рассказали, что 12 семей еще весной заселили в новые дома. Жилье им выделило государство. Предполагалось, что в домах будет водоснабжение, канализация, газоснабжение, что квартиры будут полностью благоустроены, дорога возле домов заасфальтирована. Но, как это обычно бывает, получилось все наоборот.

"Приезжайте — посмотрите, что у нас творится. В одной квартире нет линолеума, люди по бетонному полу так и ходят, стекол в балконных рамах нет, в квартирах очень холодно. Нам до сих пор газ не подвели..."

Мы приехали посмотреть. Люди с возмущением делились наболевшим: "Сколько можно газ ждать? Обещали сначала до мая все сделать, потом — до июня, а сейчас — до нового года. Сдали квартиры без дверных ручек, чем хочешь двери открывай. В первое время крыши протекали, двери все косые, гаражей возле домов нет. Мы вообще первый месяц готовили на улице, на плитке", — наперебой стали рассказывать люди.

(Продолжение на 2 стр.)

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

У сувязі з надыходзячымі святамі, наша газета вымушана будзе змяніць графік выхаду наступнага нумара. Паведамляем, што 46 нумар "Газеты Слонімскай" выйдзе ў свет у пятніцу, 10 лістапада.

ПРА ТОЕ, ШТО адбывалася на Слонімшчыне 50 гадоў назад

ЧЫТАЙЦЕ НА 3 СТР.

ЯК БАЦЬКА ЗАБІЎ СВАЙГО СЫНА

ў споведзі "Туман"

ЧЫТАЙЦЕ НА 5 СТР.

"Я ТРЫ РЭЖЫМЫ ПЕРАЖЫЎ..."



Артыкул І.Карповіча пра Анатоля Іверса

ЧЫТАЙЦЕ НА 6 СТР.

Вось, нарэшце, і выбралі

У другім туры выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі перамогу атрымаў старшыня Слонімскага райвыканкама Станіслаў Здановіч. За яго прагаласавала 20471 чалавек. За Сяргея Мудрова аддалі свае галасы 11208 выбаршчыкаў.

Такога выніку і трэба было чакаць. Што б там не казаў спадар Здановіч, але ж ён меў значную перавагу над сваім маладым канкурэнтам. Хаця б у тым, што з'яўляецца кіраўніком раённай выканаўчай улады. А менавіта ў сельскай мясцовасці ён набраў пераважную колькасць галасоў.

Карэспандэнтам "ГС" падчас наведвання сельскіх выбарчых участкаў 29 кастрычніка прыйшлося бачыць, як вясковыя бабулькі, узяўшы ў рукі бюлетэні, пыталіся ў прадстаўнікоў участковых камісій: "А за каго мне галасаваць?"... І не трэба тут асаблівая хітрысць — патрэбная падказка заўсёды магла б мець месца.

Сустрэўшы адну з жанчын з вёскі Рахавічы, некалі вядомую свінарку, пацікавіліся: каму яна аддала свой голас?

— А нейкаму Славіку, — адказала кабета.

Вясёлага тут, канечне, мала, але ўтрымацца, каб не ўсміхнуцца, цяжка.

Усе апытаныя намі людзі, якія галасавалі за пэўнага кандыдата, спадзяюцца на нейкія перамены да лепшага. Вось тая ж жанчына з Рахавіч мае надзею, што знізяцца цэны на тавары і, нарэшце, ёй паставяць тэлефон. Шафёры з саўгаса "Маладая гвардыя", якія сёння ў месяц атрымліваюць па 15 тысяч рублёў заробку, спадзяюцца на нешта большае.

Верыць у лепшае будучае — справа добрая. І, вядома, наш слонімскі дэпутат наўрад ці ўсім сваім выбаршчыкам паставіць тэлефоны, пабудуе хаты і парамантуе печы. Не яго гэта цяпер будзе функцыя. Яму ў хуткім часе прыйдзецца законы пісаць. Толькі вось — якія яны будуць і каго будуць абараняць?

Віктар ВАЛАДАШЧУК



Фота Віталя Гіля

Гэты мужчына зрабіў свой выбар. 29 кастрычніка. Сонечны выбарчы ўчастак.

ЛЮДИ УСТАЛИ ЖДАТЬ

(Начало на 1 стр.)

В тот день, когда мы приехали, одна из заселенных семей собирала вещи для переезда на прежнее место жительства. "А как здесь можно жить?" — возмутилась хозяйка. — Надоело ждать обещанного, устали..."

Вернувшись из Масилович, я позвонила председателю райисполкома Станиславу Здановичу, чтобы он прокомментировал ситуацию. "Пусть эти люди мне сами позвонят, я им отвечу. Я уже был на встрече в совхозе "Сосновка" и объяснил им, как там решаются их вопросы", — сказал Станислав Тадеушевич. Он еще раз повторил, что за счет облгаза уже приобретен газораспределительный пункт. "Это основное, что было необходимо. Хочу сказать, что в домах установлено оборудование, которое позволяет отапливать помещения твёрдым топливом. И некой колоссальной проблемы в этом плане в Масиловичах нет. До нового года будут завершены пуско-наладочные работы", — пообещал Станислав Тадеушевич.

Что касается линолеума и дверных ручек... "Это — совхозные дома, тем более, что они являются служебными и приватизации не подлежат. Поэтому пускай люди обращаются в совхоз, и им будет оказана помощь", — отметил Станислав Тадеушевич.

В свою очередь начальник капитального строительства райисполкома Иван Бабяк сказал следующее: "Мы не проведем им газ, пока не выделят деньги из бюджета. Нужно 150 метров труб, но у нас нет денег на их покупку. Мы стараемся сделать все возможное. Если бы были деньги, давно бы уже все сделали. Но денег нет. На один километр газопровода нужно 3 млн рублей. Для Масилович необходимо выделить где-то около 400 тысяч рублей. Но разве у людей есть такие деньги, если доярки получают по 15 тысяч рублей в месяц?




От новоселья одни головные боли

Согласно указа премьер-министра Ермошина, эти дома мы должны были сдать без поклейки обоев, без покраски окон, батарей... Работы должны были сделать сами жильцы. Мы сдали совхозу эти дома еще в декабре. Людей заселили только весной, поэтому, пока не было жильцов, из квартир украли линолеум, дверные ручки...

Когда мы проложим газ, я не могу сказать. Может быть, в следующем году... Хотя поставили задачу закончить все работы до конца этого года", — заверил Иван Бабяк.

Ольга ШИНКЕВИЧ,
Виталий ГИЛЬ (фото)



В траншее пока играют дети



Масиловичские новосёлы

НАВІНЫ

Можа і пайшлі б, ды не запрасілі

У рэдакцыю газеты пазваніла жыхарка Слоніма Зінаіда Дамановіч. Жанчына пакрыўдзілася на ўлады за тое, што яе з мужам не запрасілі прыняць удзел у выбарах 29 кастрычніка.

— Мала таго, што мінулым разам нас і памяць маёй свекрыві абразілі — гаворыць Зінаіда Сцяпанаўна. — На наш адрас прыйшло паштовае паведамленне на імя Бандалоўскай З.І., каб яна 15 кастрычніка прыйшла галасаваць на 25 выбарчы ўчастак, што знаходзіўся ў клубе МПМК-163. Аднак Бандалоўская (гэта маці майго мужа) тры гады таму як памерла. Пра гэта мы і паведамілі ў камісію. Там папрасілі прабачэння і па тэлефоне запрасілі нас прыйсці прагаласаваць. Што мы і зрабілі. А цяпер увогуле ніякага паведамлення мы не атрымалі. Таму на выбары мы не пайшлі, хаця мелі намер прагаласаваць за пэўнага чалавека, — сказала спадарыня Дамановіч.

Анатоль МІРСКІ

Германскі пасол на Зэльвеншчыне

Зэльвеншчыну з візітам наведаў пасол Германіі ў Беларусі Хорст Вінкельман.

Ён пабываў у Дзярэчыне, дзе сустрэўся з ксяндзом Юзэфам Файлерам, сёстрамі і братам Альбінам з мясцовага касцёла.

Пасол пабываў таксама ў Сынковіцкай царкве, наведаў вёскі Луконіца і Старое Сяло. Гэта другі візіт нямецкага пасла ў Беларусі на Зэльвеншчыну.

Пётр МАРЦІНОЎСКІ

Выставка в Гродно

Гродненский горисполком принял решение по поводу проведения в городе 2-й Национальной филателистической выставки. Выставка пройдет со 2 по 9 декабря 2000 года в Гродненском государственном историко-археологическом музее.

Ожидается участие филателистов из Беларуси, Латвии, Литвы, Польши, России и Украины. Возможен также приезд в Гродно американского коллекционера, белоруса по происхождению.

Непосредственное участие в подготовке выставки принимает предприятие "Гроднооблпочта", которое способствует выпуску почтовых конвертов и марок, отражающих исторические, национальные и культурные ценности Гродненщины. В частности, в этом году были напечатаны конверты с изображениями дореволюционного градоначальника Эдуарда Стемпневского, французского естествоиспытателя Жана Жилибера, основавшего 225 лет назад в городе медицинскую академию и ботанический сад, и академика Юрия Островского, который был первым директором Института биохимии Национальной академии наук.

Ася КУНИЦКАЯ

Старшыня гарсавета змяніў месца працы

Старшыня Слонімскага гарсавета Войцех Угрыновіч змяніў месца працы.

Як стала вядома "ГС", Войцех Эдвардавіч цяпер працуе дырэктарам рэгіянальнага цэнтра занятасці насельніцтва. Былы ж дырэктар Ганна Мазюк пайшла на пенсію.

Па словах Войцеха Угрыновіча, ён змяніў месца працы па ўласнаму жаданню і ніякага ціску на яго не было. Аднак адстаўку старшыні яшчэ павінна прыняць сесія гарадскога савета. Калі яна адбудзецца, пакуль невядома.

Трэба адзначыць, што на пасадзе старшыні гарсавета Войцех Угрыновіч працаваў з вясны 1999-га, а да гэтага быў намеснікам старшыні гарвыканкама. Цікава, што роўна год назад пакінуў пасаду старшыні райсавета Уладзімір Кемяжук (таксама па ўласнаму жаданню), які вярнуўся на ранейшую працу дырэктара саўгаса "Пераможац".

Сярод верагодных кандыдатаў на пасаду старшыні Слонімскага гарсавета называюць Людмілу Гаркаву, начальніка інспекцыі дзяржаўнага падаткавага камітэта па Слоніму і Слонімскаму раёну, дэпутата гарсавета. Праўда, Людміла Мікалаеўна ў размове з карэспандэнтам "ГС" адзначыла, што пра гэта "нічога не можа сказаць" і што па-ранейшаму працуе на сваёй пасадзе.

Танны хлеб — дзецям и хворым

Нядаўна ў слонімскіх магазінах знік танны хлеб, які прадаваўся маламаёмасным слонімцам.

Яшчэ 17 кастрычніка людзі маглі па спісах купіць бохан чорнага хлеба за 110 рублёў, а батон — за 69 рублёў. Але ўжо на наступны дзень танны хлеб не прадаваўся.

Высветлілася, што слонімскі хлебазавод спыніў яго пастаўку ў гандаль у адпаведнасці з рашэннем Гродзенскага аблвыканкама ад 13 кастрычніка гэтага года. Па словах начальніка планавага аддзела прадпрыемства Людмілы Губарэвіч, цяпер танны хлеб будуць атрымоўваць толькі школы, сады, яслі і бальніцы. Маламаёмасныя грамадзяне і пенсіянеры (былыя работнікі хлебазавода) такой льготай больш карыстацца не будуць.

Хлебазаводы іншых раёнаў вобласці, як сказала Людміла Губарэвіч, ужо даўно адмовіліся ад такой практыкі, і толькі Слонім пэўны час браў на сябе выдаткі па вырабу штодня каля тоны таннага хлеба. Хаця прадпрыемства ад гэтага несла страты.

Сяргей ЁРШ

ЗДАРЭННІ

Разагнаўся не на жарт

Кастрычніцкай ноччу ў пасёлку Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна быў абрабаваны магазін "Шчара".

Праз суткі, зноў жа ноччу, — магазін у вёсцы Дзянісава і пасялковая сталовая "Вясёлка". Міліцыя хутка вызначыла зладзея. Ім аказаўся непаўналетні жыхар адной з вёсак Дзятлаўскага раёна.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

З чыгункай не жартуюць

У сярэдзіне кастрычніка чатыры вучні 9 класа Азярніцкай сярэдняй школы вырашылі праверыць на трываласць цягнік на рэйках.

Яны прыйшлі на станцыю Азярніца і паклалі коркі ад бутэлек на рэйкі. Коркі цяжар вагонаў не вытрымалі. Далей у школьнікаў былі новыя планы. Але іх раскрылі чыгуначнікі і паведамілі ў міліцыю. Матэрыялы, звязаныя з учынкам азярніцкіх школьнікаў, накіраваны ў інспекцыю па справах непаўнагадовых Слонімскага ГРАУС.

Дзмітрый ДРОЗД,
старшы лейтэнант міліцыі

Здарэнні ў Дзярэчыне

***

У доме быў выяўлены труп дзярэчынскай пенсіянеркі Марыі Л., якая жыла адна. Яна была забіта сякерай невядомымі.

Узбуджана крымінальная справа, вядзецца следства.

***

Жыхар Дзярэчына Сяргей Ф., знаходзячыся ў нецвярозым стане, перакуліўся на калгасным трактары.

Малады мужчына быў дастаўлены ў рэанімацыю Зэльвенскай бальніцы, але выратаваць яго дактарам не ўдалося.

***

Паконнцы жыццё самагубствам 23-гадовы жыхар Дзярэчына Міхаіл К.

Яго знайшлі павешаным на верандзе суседскага дома.

Сяргей ЧЫГРЫН

Абрабавалі "Бярозку"

На мінулым тыдні ў Слоніме быў абрабаваны рэстаран "Бярозка".

Ноччу невядомыя праніклі ў памяшканне і вынеслі адтуль чатыры мяхі цукру, 30 кілаграмаў сала і тэлефонны апарат.

Міліцыя шукае злодзеяў.

Труп на Ружанскіх могілках

У мінулую пятніцу, 27 кастрычніка, у Слоніме быў выяўлены труп невядомай жанчыны.

Яе цела знайшлі на могілках, што знаходзяцца на Ружанскай вуліцы.

Чалавека забіў ток

Недарэчная смерць напаткала 52-гадовага рабочага Слонімскага ДЭУ-191.

Па існуючай версіі, мужчына, выходзячы з кабіны машыны, якая стаяла ў гаражы, перабіў дзверцай электрадрот і атрымаў удар токам. У выніку чаго ён загінуў на месцы.

Валодзя ЯНЧУК

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
.........(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Падпісана да друку 1 лістапада 2000г.
Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
Наклад 9500 экз.
Заказ № 3395

НАВІНЫ

Загад губернатара не выкананы

По выніках другога тура галасавання, перамогу ў Мастах атрымаў генеральны дырэктар юрыдычнай фірмы "Уладыка" Генадзь Дылеўскі.

Як сцвярджаюць дасведчаныя людзі, за некалькі дзён да выбараў Дылеўскі агітаваў за сябе даволі проста: ён ездзіў па вёсках на сваёй шыкоўнай машыне і частаваў старых кабетаў шампанскім і цукеркамі.

Нагадаем, што мясцовая вертыкаль не выканала патрабаванняў старшыні аблвыканкама Аляксандра Дубко, які хацеў бачыць дэпутатам галоўнага ўрача Зэльвенскага ТМА Андрэя Фрэйберга. У сувязі з гэтым, як адзначаюць дасведчаныя людзі, некаторыя мясцовыя кіраўнікі могуць пазбавіцца сваіх пасадаў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Наступает гепатит

На Гродненщине зарегистрирована вспышка вирусного гепатита А.

Уровень заболеваемости этим острым вирусным кишечным заболеванием в этом году по области увеличился в три раза. Рост зарегистрирован в 9 районах, наиболее интенсивный – в Ивьевском, Мостовском и Слонимском. Заболевание выявлено у 842 человек, 420 из которых – дети до 14 лет. В настоящее время неблагополучная ситуация с гепатитом А сохраняется на Мостовщине, где в ряде школ вынуждены были прибегнуть к объявлению карантина и сейчас принимаются меры по ликвидации очагов заболевания.

Ася КУНИЦКАЯ

Лепшыя вёскі

Дзятлаўскі райвыканкам вызначыў пераможцаў конкурсу на лепшае добраўпарадкаванне населеных пунктаў у 2000 годзе.

Самымі лепшымі вёскамі прызнаны Міроўшчына і Жукоўшчына, лепшым пасёлкам – Казлоўшчына, а таксама Дзятлава. Дарэчы, Казлоўшчына і Дзятлава будуць удзельнічаць у абласным конкурсе.

Для модніц

У пасёлку Наваельня Дзятлаўскага раёна з'явіўся новы суб'ект гаспадарання.

Святлана Курлюта будзе займацца розьнічным гандлем і вытворчасцю галаўных убораў.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

СЛОНІМ. НАШЫ ЛЮДЗІ



Фота Віталя Гіля

ЧИТАТЕЛЯМ ОТВЕЧАЕТ СПЕЦИАЛИСТ

Плати налоги своевременно

В редакцию "ГС" обратился читатель Александр Петров с некоторыми вопросами.

В частности, он хочет знать: кто является плательщиком налога на недвижимость и землю; кому предоставляются льготы по данным видам налогов; какую ответственность несут лица за несвоевременную уплату налогов?

На вопросы отвечает старший налоговый инспектор Государственного налогового комитета по городу Слониму и Слонимскому району Анатолий **Ибрагимов**.

1) Плательщиками налога на недвижимость являются физические лица, имеющие на территории Республики Беларусь в собственности жилые дома, надворные постройки, гаражи, здания в садоводческих товариществах.

Налоги на землю платят физические лица, которым земельные участки предоставлены во владение, пользование либо собственность.

2) Льготниками по налогам на недвижимость и землю являются пенсионеры по возрасту, инвалиды I и II групп и другие нетрудоспособные граждане при отсутствии трудоспособных лиц, совместно проживающих или прописанных по данным домовых книг.

3) На основании ст. 8 п. 1г закона "О налогах и сборах, взымаемых в бюджет РБ" за несвоевременную и неполную уплату налогов гражане несут ответственность согласно вышеуказанного закона по ст. 9 п. 12 в виде штрафа от 2-х до 5-ти минимальных заработных плат. В настоящее время это от 7200 рублей до 18000 рублей. Уплата штрафа не освобождает от уплаты налогов. Незнание размеров суммы, которую нужно заплатить в виде налогов, не освобождает от административной ответственности.

Анатолий Ибрагимов рекомендует гражданам, поменявшим место жительства или же не получившим извещение об уплате налогов, обратиться в ИГНК по Слониму и Слонимскому району по тел. 2-17-98.

50 ГАДОЎ НАЗАД У СЛОНІМЕ І РАЁНЕ...

- Працавала 400 настаўнікаў, а ў школах вучылася 10.500 дзяцей.
- Было створана 55 калгасаў. А 4 студзеня ў вёсцы Талькаўшчына з'явілася сельскагаспадарчая арцель імя Сталіна. Такіх арцеляў на той час ужо налічвалася ажно 73.
- Часта білі калгаснікаў і старшынь калгасаў. Напрыклад, на два гады былі асуджаны Васіль Аляксейчык, які пабіў старшыню калгаса імя Леніна Міжэвіцкага сельсавета.
- Калектыў Слонімскага лесазавода № 16 аднадушна вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Савета Саюза па Баранавіцкай акрузе Сталіна, Леапатава, Шверніка, Булганіна і Закурдаева.
- Дэманстраваўся мастацкі двухсерыйны фільм "Падение Берлина".



Аратаі калгаса імя Дзмітрава вёскі Хадзявічы, пачатак 50-х гадоў

- Паспяхова развівалася радыёфікацыя. Гарадскі радыёвузел штодзённа трансліраваў перадачы з Масквы і Мінска на 1250 рэпрадуктараў горада і 9 вёсак.
- Людзі з радасцю ўспрынялі пастанову Савета Міністраў СССР і ЦК ВКП (б) "Аб новым зніжэнні дзяржаўных рознічных цэн на харчовыя і прамысловыя тавары". Напрыклад, цэны на макаронныя вырабы знізіліся на 25%, на чорную ікру – на 30%, на піва – на 30%, на квас – на 22%, на вінаград – на 25%, на хлеб – на 25-30%, на селядцы – на 30%, на гарэлку – на 16,7%, на тканіну – на 12-22%, на абутак – на 10-25%, на будаўнічыя матэрыялы – на 20% і г.д.
- 12 сакавіка ўсе аднагалосна прынялі ўдзел у выбарах дэпутатаў у Вярхоўны Савет СССР. На некаторых участках да 10 гадзін раніцы ўжо ўсе прагаласавалі.
- Адсвяткавалі ўрачыста 80-годдзе з дня нараджэння Ульянава-Леніна.
- Калектыў Слонімскага ўчастка ўпраўлення малых рэк пусціў на Шчару новую пабудаваную баржу, якая дастаўляла ў горад торф і іншыя грузы.
- Працоўныя падпісаліся на пятую дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР.
- 27 мая пачалі выходзіць дзве новыя газеты – "Голас калгасніка" (орган палітаддзела Рышчыцкай МТС) і "Трыбуна калгасніка" (орган палітаддзела Слонімскай МТС).
- Калектыў мастацкай самадзейнасці РДК падрыхтаваў прэм'еру новага спектакля "Шляхі-дарогі" па п'есе Г. Фёдарава. Рэжысёр М. Фрыдман.
- У Новых Дзевяткавічах была пабудавана сельская бальніца на чатыры палаты.
- Было прынята рашэнне Слонімскага райвыканкама ад 21 мая. Згодна гэтага дакумента, усе жыхары, якія маюць сабак, павінны іх зарэгістраваць у гаркамгасе. Сабакі павінны ўтрымлівацца на прывязі. Вывад сабак на вуліцу дазваляўся толькі на павадку і ў намордніку.
- У саўгасе "Слонімскі" была пабудавана і пушчана ў эксплуатацыю электрастанцыя.
- 1479 мнагадзетных і адзінокіх маці атрымлівалі дзяржаўную дапамогу. З іх – 982 былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Сярод іх – Пелагея Русак з Чырвонаармейскай вуліцы, якая выхавала 11 дзяцей, Ганна Качарга з Нагуевіч, якая мела 12 дзяцей і інш.
- У Слоніме было высаджана 499 новых дрэў.
- Значна папоўніўся кніжны фонд бібліятэк і хат-чытальняў. На працягу года для іх было закуплена 9716 кніг.

Падрыхтаваў Сяргей ЧЫГРЫН



Фотаздымак з архіва Вячаслава Сцяпуры

Вось такія баржы плавалі ў пачатку 50-х гадоў па Шчары

НАВІНЫ

Безвыніковае супрацоўніцтва

Некаторыя мастаўчане, мабыць, памятаюць, як стваралася сумеснае чэшска-мастоўскае прадпрыемства "Мост-Эдэн". Арганізоўвалася яно на базе АТ "Мастоўдрэў".

Спачатку гэта быў цэх вытворчасці дзвярных палотнаў. У кіраўнікоў праекта былі вялікія надзеі. Нават пачалося будаўніцтва офіса. І месца выбралі прыдатнае, у цэнтры горада, ля вуліцы Савецкай, насупраць гарадскога мінірынку. Увішліва шчыравалі будаўнікі АТ "Мастоўдрэў" над закладкай фундамента. Патрабавальныя чэхі прымушалі іх па некалькі разоў перарабляць перагародкі. Але неўзабаве чэхі адмовіліся ад супрацоўніцтва. Будаўніцтва будынка спынілася на ўзроўні нулявога цыкла. І хоць на ўзвядзенне падмурка былі затрачаны пэўныя сродкі, ён аказаўся нікому не патрэбным і зарос бур'янам.

Потым мастоўскія дрэваапрацоўшчыкі спрабавалі наладзіць сувязі з італьянцамі. Кіраўнікі тутэйшага прадпрыемства паспяшаліся ў Італію, толькі там, відаць, зразумелі безвыніковасць такіх сувязей.

Той цэх, што павінен стаць сумесным прадпрыемствам, зараз называецца мэблевы цэх №2.

І як помнік мастоўска-чэскаму супрацоўніцтву стаіць пасярод горада зарослы бур'янам падмурак.

Язэп ПАЛУБЯТКА

На абед бульбу пякуць у сушылцы

У сувязі з нізкімі заробкамі, работніцы прадпрыемства "Мастоўдрэў" прыносяць з сабой бульбу і пякуць яе проста ў прамысловых сушылках.

Атрымліваецца добры абед, бо сяды-тады ім выдаюць да бульбы малако.

Ліса прыйшла на падворак

Ліса прыйшла на падворак гаспадара вёскі Алешавічы Мастоўскага раёна.

Мужчына яе забіў і зняў скуру. На дзіўныя паводзіны звера звярнулі ўвагу суседзі і западозрылі звера ў шаленстве. Скуру на экспертызу ўзяла санэпідэмстанцыя, а ўся сям'я вымушана была звярнуцца ў бальніцу, дзе пройдзе спецыяльны курс лячэння.

Змены працягваюцца

У калгасе "Чырвоная зорка" Мастоўскага раёна з'явіўся новы старшыня. Ім стаў Сяргей Паўшок.

Ён замяніў на гэтай пасадзе Івана Шымановіча, які кіраваў гаспадаркай менш чым два гады.

Замуж хочацца

З пачатку бягучага года ў Мастоўскім ЗАГС дванаццаці непаўнагадовым грамадзянам не па ўзросту было дазволена ўступіць у шлюб па ўважлівых прычынах.

Пад гэтымі прычынамі заканадаўства, у прыватнасці, прадугледжвае нараджэнне сумеснага дзіцяці ці наяўнасць даведкі аб пастаноўцы на ўлік па цяжарнасці.

Антон МАКЕЙ

ВОТ И ПОИГРАЛИ С ХВОСТОМ

42-м учащимся средней школы № 9 Бреста предстоит пройти курс антирабической вакцины, так как все они могут заболеть бешенством.

Как сообщили БелаПАН в областном Центре гигиены и эпидемиологии, 22 октября два школьника и учащийся железнодорожного техникума в охотничьей петле рядом с дачным товариществом "Ивушка" Брестского района нашли лису. Попытки снять с нее шкуру оказались безуспешными, поэтому ребята отрезали у животного хвост, а труп закопали. Некоторое время хвост "гулял" по школе, пока этого не заметила медработник. Она сказала ребятам, что нужно проверить, не была ли лиса больна бешенством. Школьники сами пошли в Центр гигиены и эпидемиологии, так как там работала мать одного из них. Тут же труп лисы был откопан и исследован на бешенство: анализы подтвердили наихудшие предположения медиков.

На сегодняшний день выявлено 42 человека, которые играли с хвостом (как известно, чтобы заразиться вирусом бешенства, достаточно лишь погладить животное). Всем им предстоит пройти курс вакцинации. Ребятам, которые разделывали труп, – до 12 прививок, остальным – до 7-ми. Эти прививки, по словам медиков, небезопасны для здоровья и не дают 100-процентной гарантии того, что люди не заболеют бешенством.

В этом году в Брестской области выявлено около 40 случаев заболевания бешенством среди животных. В контактах с ними были более 250 человек.

БелаПАН

В НАЛОГООБЛОЖЕНИИ НАМЕЧАЮТСЯ ИЗМЕНЕНИЯ

В проекте бюджета Беларуси на 2001 год не содержится кардинальных изменений в сфере налогообложения, но в целом предусмотрено некоторое снижение налоговой нагрузки. Об этом 24 октября на пресс-конференции в Минске заявил заместитель министра финансов Беларуси Иван Шунько.

По его словам, предусматривается, что налоговая нагрузка в 2001 году составит 34,5 процента – на 0,6 процента меньше показателя, который ожидается по итогам исполнения бюджета нынешнего года. Это будет достигнуто за счет снижения с 1,5 до 1 процента ставки отчислений в фонд поддержки сельхозпроизводителей. Кроме того, в целях упрощения расчетов и сокращения общего количества налогов будет произведено объединение некоторых налогов и отчислений в бюджетные фонды, которые имеют сходную налоговую базу. Например, в единый платеж объединяются отчисления в фонд поддержки сельхозпроизводителей и дорожный фонд; отчисления в фонд содействия занятости будут объединены в единый платеж с чрезвычайным налогом. Однако, как подчеркнул Шунько, это объединение происходит лишь на стадии взимания и не касается расходования данных средств.

В то же время налог на прибыль увеличивается с 25 до 30 процентов. Ряд изменений предусматривается и в сфере взимания местных налогов. Так, перечень этих налогов сделан "закрытым", чтобы, по словам замминистра финансов, у местных органов власти не было соблазна расширять их список до бесконечности.

Несмотря на ряд нововведений и унификацию налогового законодательства с российским, снизить ставку подоходного налога до 13 процентов, как в России, в Беларуси не планируется. Максимальная ставка подоходного налога в республике останется прежней – 30 процентов. В белорусском Минфине считают, что ставка в 13 процентов – "это не оптимальный вариант, который можно теперь принимать". По словам Шунько, в России снижение ставки подоходного налога происходит наряду с резким уменьшением количества предоставляемых льгот, а это уже вопрос социальный.

Алексей ОРЕШКО

В НОВОМ ГОДУ — НОВЫЕ ТАРИФЫ

Через два года в Беларуси прекратится практика перекрестного субсидирования коммунальных услуг, когда из-за относительно низких тарифов для населения основную нагрузку несут промышленные предприятия. Об этом было заявлено 24 октября в Минске на пресс-конференции с участием руководства Белорусского государственного энергетического концерна "Белэнерго".

В настоящее время население оплачивает 19 процентов себестоимости тепловой энергии и около 50 процентов – электрической. Предприятия доплачивают 0,79 американских цента (8,3 рубля в пересчете по официальному курсу) за каждый киловатт-час электроэнергии и 10–11 долларов (10.540–11.594 рубля) за каждую гигакалорию тепловой энергии. Предполагается, что в 2001 году тарифы для населения будут покрывать половину себестоимости тепловой энергии и полностью – себестоимость электрической энергии. Правда, по словам президента концерна "Белэнерго" Евгения Мишука, "в самое ближайшее время" повышения тарифов на электрическую энергию не планируется.

При этом руководители концерна подчеркнули, что в Западной Европе тарифы на электроэнергию для населения выше, чем для предприятий: к примеру, в Германии – в 1,8 раза, во Франции – в 2,5 раза. В советские времена население платило в 2 раза больше – 4 копейки за киловатт-час, тогда как предприятия – 2 копейки. По мнению руководства концерна, это было справедливо, поскольку "предприятия покупают энергию оптом, а население – в розницу".

Дмитрий ВЛАСОВ

БИБЛИЯ НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

Первый белорусский перевод полного текста Библии планируется издать до конца нынешнего года отдельной книгой тиражом в пять тысяч экземпляров.

Как сообщил БелаПАН технический редактор текста Антоний Бокун, книга подготовлена к изданию общественным объединением "Дыярыуш", парафиями греко-католической церкви Бреста и святого Иосифа (Минск) и будет выпущена издательством "Сафія" (Полоцк, Витебская область).

По словам Бокуна, книга станет результатом почти 20-летнего труда отца Владислава Чернявского, который проживает в деревне Вишнево Воложинского района Минской области. В одном из своих писем отец Владислав писал, что "гэтым хацелася прыслужыць беларускаму народу, каб ён, як кожны народ, маліўся і чуў Божае Слова ў сваёй роднай мове".

Однако, как отметил технический редактор книги, "ни духовные, ни светские власти Беларуси не проявили интереса к изданию белорусского перевода Библии, и дело движется вперед только благодаря общественной инициативе".

Вместе с тем Антоний Бокун высказал надежду, что издание Библии в переводе отца Чернявского станет важным вкладом в дело национального возрождения.

Справка БелаПАН. По свидетельству Библейского общества, на сегодняшний день полные тексты Библии или Нового Завета переведены на 586 языков. Для многих народов мира первой книгой, написанной или напечатанной на их родном языке, была Библия. Так, первым изданием изобретателя книгопечатания Иоганна Гутенберга была Библия, выпущенная в середине XV века. Ее же первой напечатал и великий белорусский просветитель средневековья Франтишек Скорина в 1517–1519 годах.

В XX столетии было сделано несколько переводов Нового Завета на белорусский язык. Один из них, наиболее известный и, по-видимому, наиболее удачный, – перевод Лукаша Декуть-Малея и Антона Луцкевича – выдержал три издания в 1931, 1948 и 1985 годах. В последние годы появились белорусские переводы Нового Завета, созданные Василем Семухой в 1995 году и Анатолем Клышкой (печатался в журнале "Спадчына" за 1990–1992 годы).

Отдельные книги Ветхого Завета выходили в переводах Яна Петровского и Василя Семухи, а полный текст Библии был издан в переводе Янки Станкевича в Нью-Йорке в 1973 году. Однако, как считают специалисты, этот перевод не получил широкого распространения из-за того, что его текст несет на себе сильный отпечаток личности переводчика с его своеобразным взглядом на белорусский язык.

Марат ГОРЕВОЙ

Неутешительные прогнозы

Несмотря на некоторое увеличение в октябре поставок в Беларусь российской нефти, в ноябре они могут сократиться.

Как сообщил БелаПАН источник в белорусском правительстве, основанием для такого прогноза является постоянный рост цены на российскую нефть. Уже в октябре Беларусь была вынуждена уменьшить объемы закупок нефти в России из-за ее высокой стоимости – 177 долларов США за тонну. В результате с начала октября поставки нефти на крупнейшее нефтеперерабатывающее предприятие – ПО "Нафтан" – сократились на 8 процентов.

Ожидается, что в ноябре стоимость одной тонны российской нефти вырастет до 185 долларов США. Впрочем, даже приобретая ее по такой цене, у белорусского правительства нет уверенности в том, что сырья будет достаточно, так как свободных ресурсов на российском рынке нет.

Пока же, по данным концерна "Белнефтехим", белорусские НПЗ работают стабильно, а нефть из России поступает в строгом соответствии с соглашением, заключенным между правительством Беларуси и Министерством топлива и энергетики России.

Виктория МЕЖИЕВА

С таксофона будем звонить в Америку

С 1 ноября в Минске вводятся в действие телефонные карты большой емкости для универсальных таксофонов, имеющих жидкокристаллический индикатор.

Как сообщили БелаПАН в республиканском государственном объединении "Белтелеком", поводом стали многочисленные нарекания на качество нынешних телефонных карт и малая функциональность городских таксофонов.

Универсальные таксофоны, позволяющие звонить как по городу, так и в другие регионы Беларуси, появились полтора года назад. Звонки осуществлялись при помощи городской телефонной карты, но из-за большой разницы в тарифах не было возможности организовать разговоры с абонентами из других стран: обычной карточки хватило бы на несколько секунд разговора.

Карты большой емкости позволят исправить положение. На первом этапе планируется выпуск карт на 500 и 750 тарифных единиц. Карта на 500 единиц рассчитана на 8 с половиной часов разговоров внутри города либо на 7 часов разговоров по области, либо на 3 часа 40 минут разговоров по республике, либо на 10 минут связи с Россией, либо на 8 минут – с Европой, либо на 2 минуты – с США.

Каждая карта будет продаваться в отдельной пленочной упаковке, что, по словам представителей РО "Белтелеком", станет гарантией их работоспособности. Пользоваться ими можно будет только с универсальных таксофонов. В Минске их сейчас около 500, а к концу года станет 700.

С 1 ноября старые таксофонные карты будут пригодны только для звонков по городу с обычных и универсальных таксофонов.

С 27 октября новые карты продаются в киосках РО "Белпочта", в отделениях связи и пунктах коллективного пользования РО "Белтелеком". Стоимость карты на 500 единиц – 2.610, на 750 – 3.750 рублей.

В скором будущем такие карты должны появиться и в других областных центрах страны.

Откуда деньги у честной женщины?

Экс-председатель правления Национального банка Беларуси Тамара Винникова, находящаяся сейчас в Великобритании, "может вернуться в республику и ничего не опасаться". Об этом заявил генеральный прокурор Олег Божелко на пресс-конференции в Минске.

Божелко сообщил, что недавно получил от Винниковой три заявления. В частности, экс-банкира беспокоят вопросы ее собственности, а также возможность возвращения в Минск. Генеральный прокурор заявил, что если банкир вернется и будет сотрудничать со следствием, то принятая в отношении ее мера пресечения в виде содержания под стражей может быть изменена на подписку о невыезде. Напомним, что Винникова была задержана правоохранительными органами в январе 1997 года по подозрению в хищении в особо крупных размерах и злоупотреблении служебным положением. Осенью того же года экс-председатель правления Нацбанка была освобождена из-под стражи и находилась под домашним арестом. Весной 1999 года ей удалось скрыться.

Генеральный прокурор, сославшись на следователя по делу Винниковой, заявил, что вина бывшего банкира будет доказана. Он сообщил, что только в Беларуси на счетах Винниковой находится около 180 тысяч долларов США. Как отметил Божелко, возникает вопрос: откуда у честной женщины такие средства.

БелаПАН

У вучылішчы, дзе я выкладаю электратэхніку, быў сход, і таму з работы я прыехаў позна. На ўскрайку пасёлка, дзе стаіць наш дом, свяціў адзіны на ўвесь мікрараён ліхтар, і пад ім на бардзюры сядзелі хлопцы, стаялі купкай дзяўчаты. Не ведаю чаму, але мясцовая моладзь мела звычку бавіць час менавіта тут, пад гэтым ліхтаром. Як толькі сцямнее, так і збіраюцца.

Была сярэдзіна кастрычніка. Дні стаялі цёплыя, але ноччу з бліжэйшых кустоў белай мядзведзіцай выпаўзаў туман і ахутваў усё навакольле. Днём ён мог праліцца нудным дажджом, а мог і падняцца, пусціўшы на зямлю развітальнае сонечнае цяпло.

Як толькі заехаў на надворак, на ганак выскачыла жонка:

— Раман, не заганяй машыну ў гараж. Прыйдзецца табе з'ездзіць у Баранавічы, сустрэць з начнога цягніка Таню. Яна прыедзе з Брэста, каб дапамагчы нам выбраць буракі. Зараз можа мароз прыцісне, а наша дзялка яшчэ не пачынана.

Гэта паведамленне мяне, канечне, не ўзрадавала. Стаміўся на рабоце, потым на сходзе гадзіны дзве слухаў: калегі пералівалі з пустога ў парожняе, так нічога толкам і не вырашыўшы, як трэба выхоўваць навучэнцаў, каб не пілі, не курылі, не кралі. А тут яшчэ ў Баранавічы едзь. Але ж нічога не зробіш: жончыну сястру сустрэць трэба, бо і сапраўды з гэтымі буракамі мы да Каляд не ўправімся.

Я павячэраў, паглядзеў нейкі фільм па тэлевізары і накіраваўся ў дарогу. Ехаць трэба было ледзь не сотню кіламетраў. Была першая гадзіна ночы, цягнік прыходзіў у дзве, так што часу хапала.

Калі стужка асфальту спусцілася ў нізіну, з кустоў алешніку выплыў густы туман. Ехаць стала цяжка. Нічога не было відаць, калі асляплялі сустрэчныя машыны. Некаторыя вадзіцелі не пераключаліся на бліжняе святло, і тады нейкае імгненне я зусім нічога не бачыў. Нечакана мае "Жыгулі" моцна страсянуліся. Было такое ўражанне, што нешта стукнула аб капот і бампер. Я спыніўся, выйшаў з машыны. Непадалёку на абочыне дарогі ніцма ляжаў чалавек.

— Чалавека забіў!!! — маланкай пранеслася ў галаве.

Цела маё скаваў смяротны жах, перад вачамі ясна ўявіліся турэмныя краты.

Я стаяў і не мог паварушыцца, а чалавек ляжаў і таксама не варушыўся.

Калі здранцвенне крыху прайшло, хацеў падысці бліжэй, паглядзець хто, ці жывы, ці дыхае? Але раптам на дарозе ў тумане заблішчалі фары машыны.

— Уцяку! Ніхто ж не бачыў, ніхто не дакажа... Ці мала хто тут каго мог збіць.

Я сеў за руль і ледзь завёў машыну, бо рукі дрыжалі, ногі не слухаліся. Але страх гнаў наперад. Праехаў яшчэ кіламетраў з дзесяць уперад і вакольнымі дарогамі вярнуўся ў пасёлак. "Ніякіх Баранавіч, ніякай сваячкі! Трэбы паглядзець машыну, ці не засталося дзе слядоў, а калі засталіся, то неадкладна ліквідаваць іх".

У хаце святла не было. Жонка спала. Я адчыніў дзверы гаража і паволі заехаў туды, уключыў святло. Цяпер увесь свет сціснуўся да памераў гэтай невялічкай будынінкі. Усё, што рабілася за яе сценамі, мяне не цікавіла. Трэба было ратаваць сваю скуру. Я падышоў да машыны спераду і ўбачыў, што бампер і капот значна пагнуты. Стараючыся не нарабіць шуму і не пабудзіць суседзяў, пачаў выраўноўваць. Пасыпалася фарба.

— Усё пустое, — падумаў з горыччу. — Каб замесці сляды, трэба загнаць машыну да добрага майстра, які б і выраўняў, і зашпакляваў, і пафарбаваў. А так на вуліцу высоўвацца нельга: усякі спытае, што гэта ў цябе з машынай.



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Рашэнне прыйшло хутка. У невялікім гарадку за семдзесят кіламетраў ад нашага пасёлка жыў мой брат, а яго сусед якраз і займаўся рамонтам машын. "Да раніцы паспею і туды заехаць, і назад вярнуцца. Брата папрашу, каб прывёз".

Брату я расказаў усё. Ён паабяцаў дапамагчы адрамантаваць машыну і згадзіўся завезці мяне дадому.

Мы прыехалі ў пасёлак, калі ў дамах яшчэ не гарэла святло: местачкоўцы любяць паспаць. Вокны майго дома таксама былі цёмныя. Я адамкнуў дзверы сваім ключом, і мы ўвайшлі ў цёплае памяшканне. Пачуўшы крокі, прачнулася жонка. Яна выйшла са спальні, кутаючыся ў квяцісты халат.

— Во, замест маёй сястры прывёз свайго брата! — здзівілася, вітаючыся з Сяргеем. А дзе ж Таня?

— Відаць, на цягнік не паспела. Пазней прыедзе, — зманіў я.

— Вось табе на! — абурылася жонка. — І гэта не прыехала, і сын невядома дзе цягаецца цэлую ноч. А вернецца раніцой, дык спаць заваліцца.

— А што, Міша з арміі вярнуўся? — здзівіўся брат. — Я і не ведаў.

— Тыдзень ужо як вярнуўся, ды адразу ж да дзеўкі ў суседнюю вёску ўлёг. Мо жаніцца будзе, а на работу ўладкоўвацца не спяшаецца.

— А навошта яму тая работа? Паспее яшчэ, няхай пагуляе. Ён жа ў вас адзін, так што і абуеце, і адзенеце. Не пяцёра ж, як у мяне, — не то з гонарам, не то са шкадаваннем сказаў брат.

Жонка хуценька згатавала сняданак, мы перакусілі, і брат паехаў дадому, а я ўжо апрануўся і збіраўся ісці на работу, як раптам дзверы адчыніліся і ў хату ўбегла суседка.

— Кацярынка, Раманка... — прастагнала яна і, закрыўшы твар далонямі, загаласіла. Мы няўцямна пазіралі на яе.

— Што здарылася?! — апамятаўшыся, падбегла да суседкі жонка.

— Бяда якая?

— Ой, бяда, Кацярынка, ой, бяда... Вашага Мішу на дарозе збіла нейкая машына. Вадзіцель з месца здарэння ўцёк, не дапамог яму, не завёз у бальніцу, вырадак. Мой зяць, які ўрачом на "хуткай дапамозе" працуе, пазваніў мне і расказаў. Кажа, каб хто раней нарваўся, то хлопца можна было б выратаваць, а так надта шмат крыві страціў і памёр. Усе машыны па дарозе ехалі і вадзіцелі думалі, што п'яны ляжыць. Туман жа быў, свету не відаць, — апавядала суседка.

Жонка без прытомнасці асунулася долу. Суседка пабегла па нашатыр, а заадно і выклікаць "хуткую дапамогу", бо ў нас тэлефона не было. А што рабілася са мной — словамі перадаць не магу: жах, боль, віна звіліся ў вяроўку і душылі за горла, стрэламі праціналі сэрца. Нібы п'яны, я выйшаў на ганак і сеў на вільготныя ступенькі. Туман быў наўкола мяне, туман быў у маёй галаве, у душы, у свядомасці.

Прыехала "хуткая дапамога". Жонцы, відаць, зрабілі нейкія супакойваючыя ўколы, бо яна неўзабаве выйшла на ганак і невідушчымі вачамі паглядзела на мяне, спакойна спытала:

— Што будзем рабіць, Раманок, як выпраўляць свайго адзінага сынка ў апошнюю дарогу? Трэба, каб міліцыя абавязкова знайшла таго вырадка, што забіў нашага Мішу. Збіў і не паглядзеў, ці жывы. А яго ж у бальніцу трэба было. Дактары выратавалі б.

— Ага, урач сказаў, што ён яшчэ дзве гадзіны жыў пасля аварыі, — прамовіла фельчар "хуткай дапамогі", якая, набраўшы лекаў, хацела зрабіць укол і мне. Я адмовіўся. Я хацеў памерці.

— Знойдуць злачынцу, абавязкова знойдуць, — суцешыла суседка, калі медыкі паехалі ад нашых варот. — У яго ж на машыне, пэўна, нейкія сляды засталіся. Быць не можа, каб не засталіся, гэтак хлопца стукнуў. Казаў зяць, што паламаліся рэбры і ўпіліся ў лёгкія...

Далей слухаць я не мог. Усхапіўся з ганка і пабег на той канец пасёлка, дзе знаходзіцца наш пасялковы савет. Там ёсць кабінет участковага. Але капітана Навумчыка не было. Тады я ўварваўся да старшыні:

— Пазваніце ў міліцыю! Гэта я забіў свайго сына! Але я ... не хацеў гэтага, не хацеў...

Калі прыехала міліцыя, папрасіў, каб забралі мяне, зачынілі ў камеру і не выпускалі ніколі, каб я там згніў, памёр! Я не мог бачыць звар'яцелыя ад гора вочы жонкі, не мог глянуць на сына, які будзе ляжаць у труне, у магіле... А я буду хадзіць па зямлі і бачыць чорнае сонца, чорныя кветкі, чорныя дамы...

Мне дазволілі пайсці на пахаванне Мішы, але я не пайшоў. Людзі асуджалі. І правільна рабілі, але я не мог, не мог... Я ляжаў на нарах без ежы і вады цэлы тыдзень. Мяне не трывожылі. І калі абраслы, схуднелы і страшны нарэшце ўстаў на ногі, мяне адпусцілі. Не хацеў ісці дадому. Адправілі. Да суда.

Але і суд той збавення не прынёс. Ён пакінуў мяне на волі, прысудзіўшы тры гады ўмоўна. Мабыць ведалі, што горшай кары, якую зрабіў сабе сам, ужо не прыдумаеш.

Хацеў накласці на сябе рукі, але веру ў Бога і баюся прыняць на душу яшчэ адзін грэх.

Божа! Чаму ж я не спыніўся ў тую туманную ноч, не падышоў да сына, не завёз яго ў бальніцу. І калі б гэта быў нават не мой Міша, то ўсё роўна ж нечый сын, ці муж, ці бацька.

Позна прыйшло разуменне таго, якія ж мы іншы раз бываем эгаістычныя, бяздушныя ў адносінах да чужой бяды. І толькі, калі яна возьме за горла цябе самога, сцісне так, што ні дыхнуць, ні глянуць на белы свет, тады разумееш. Ды позна, позна...

Я жыву, як у тумане. Смерць мне здаецца вялікай раскошай. Але яе таксама, відаць, трэба заслужыць...

З павагай,
Раман Віктаравіч

ПРИЧИНЫ УДАЧ И НЕУДАЧ

Тот, кто пытался "протолкнуть" в своей жизни какое-нибудь дело, решение которого зависит не только от собственных усилий, а и от мнения других людей, знает, как бывает тяжело создать нужную ситуацию, а за ней и действие другого человека.

Мы знаем людей, которые удивительно удачно меняют свои квартиры, знаем и таких, которым в этом вопросе все время не везет. У каждого на работе есть примеры коллег, которым ничего не стоит подписать у начальника нужную бумагу и есть сотрудники, которых бесполезно посылать на такое "дело", особенно, когда руководитель совершенно непредсказуемый самодур и принимает решение, исходя не из пользы дела или логики, а по одному ему понятному мотиву.

В чем же причина этих удач и неудач?

Прежде, чем ответить на этот вопрос, поговорим о том, как человек, от которого зависит исход вашего дела, чиновник или деловой партнер, принимает решение. Если вы думаете, что он будет оценивать его объективно, как компьютер, скрупулезно учитывая все плюсы и минусы, то вы глубоко заблуждаетесь. Более того, если вы так думаете, то почти наверняка входите в категорию неудачников. Психологические исследования в области принятия решений показывают, что такого практически никогда не бывает. Любой чиновник, к которому вы придете, или любой человек, от которого зависит ваше дело, будет оценивать ситуацию не логически, а с помощью своей интуиции, своих чувств. Любое человеческое решение связано с таким количеством неопределенностей, что только интуиция человека может подсказать ему правильное решение.

Итак, человек при принятии решения руководствуется, в основном, интуицией. На что же опирается его интуитивное решение? Оказывается, на ваше эмоциональное состояние. Человек, который решает вопрос, связанный с вами, не может знать всего о вашем деле. Поэтому он пытается ОЩУТИТЬ вас. Ощутить, что вы сами чувствуете по поводу вашего дела. Уверены вы или нет? Страшна ли для вас неудача? Любой человек эмоционально зависит от окружающих людей. Если вы начинаете с кем-то разговаривать, то вступаете с ним в эмоциональные взаимосвязи, которые проходят помимо сознания, но тем не менее влияют на принятие решения. При этом у каждого человека существует своя, особая тактика такого эмоционального реагирования. Один принимает положительное решение, если чувствует вашу уверенность, другому, наоборот, нужно чувствовать вашу неуверенность. Третий может поступать и так, и этак, по всякому, в зависимости от того, как говорят в народе, с какой ноги встал.

Сергей РОЗОВ

(Продолжение в следующем номере)

ПАМЯЦЬ

“Я тры рэжымы пераэжыў...”

Чытачы шануюць памяць пра гэтага чалавека, які прайшоў складаную жыццёвую і творчую дарогу. Калісьці Алег Лойка сказаў: “Анатоль Іверс – чалавек з легенды...”.

Выступаць у друку з вершамі паэт пачаў у 30-ыя гады. За сваё жыццё выдаў шэсць зборнікаў паэзіі: “Песні на загонах” (1939), “З пройдзеных дарог” (1970), “Жыву ў бацькоўскім краі” (1982), “Я пайшоў бы ўслед за летам” (1987), “Прыдарожныя сосны” (1995) і “Травень” (1997). Нават гледзячы на даты выхаду ў свет гэтых кніжак, можна здагадацца, наколькі няпростым быў творчы шлях Анатоля Іверса.

Іван Міско нарадзіўся 5 траўня 1912 года ў вёсцы Чамяры, а калі быць дакладным – на хутары каля Чамяроў. Гэты хутар застанецца ў сэрцы паэта на ўсё жыццё. Там вырас, адтуль паехаў вучыцца, там жыла яго маці, якую ён страціў у маладосці, адтуль пайшлі ў сваю апошнюю дарогу жонка паэта Вера і бацька, забітыя фашыстамі. У вершы “Даўно на хутары не быў” Іверс з горыччу скажа:

Даўно на хутары не быў —
Баюся, сэрца не стрывае...


Яшчэ з юнацкіх гадоў Іван Міско абраў для сябе шлях змагара за Беларусь. Будучы навучэнцам Віленскай беларускай гімназіі, у 1926 годзе ён уключаецца ў рэвалюцыйную барацьбу супраць польскіх уладаў. Сярод равеснікаў Іван Міско вызначаўся ў той час актыўнасцю ў грамадска-палітычным жыцці. Ён разносіў лістоўкі, выступаў на сходах і мітынгах, удзельнічаў у дэманстрацыях, падтрымліваў сувязь з палітычнымі вязнямі. І калі ў гімназіі пачалася забастоўка супраць выключэння з гімназіі старшакласнікаў за ўдзел у палітычнай барацьбе, Іван Міско прыняў у ёй актыўны ўдзел. Паліцыя разагнала забастоўшчыкаў, каля ста гімназістаў былі выключаны з гэтай навучальнай установы, а Івана Міско пад канвоем прывезлі ў Чамяры і пад распіску здалі бацькам.

Потым былі яшчэ дзве спробы працягнуць адукацыю ў Клецкай і Віленскай гімназіях, але і адтуль “бунтар” Міско быў выключаны. Яго “універсітэты” закончыліся ў 1931 годзе. З гэтага часу юнак цалкам аддае сябе рэвалюцыйнай барацьбе і паэтычнай творчасці. Ён тройчы быў асуджаны польскім судом, неаднойчы арыштоўваўся дэфензівай (тайная паліцыя ў даваеннай Польшчы – **рэд.**). Так з-за арышту паэт не трапіў у 1934 годзе на I з'езд рэвалюцыйных пісьменнікаў. Да з'езда быў падрыхтаваны Зварот групы паэтаў, якія падпісаліся: Піліп Пястрак, Янка Чабор, Міхась Васілёк і Анатоль Іверс. Гэты Зварот быў надрукаваны 25 студзеня 1934 года ў часопісе “Літаратурная старонка”. Там жа быў надрукаваны і першы верш маладога паэта “Вёска”. Тыраж часопіса быў канфіскаваны. З друкарні ўдалося вынесці толькі некалькі асобнікаў.

Пра псеўданім паэта Алег Лойка распавядае так: “Іван Міско, блізкі пераемнік рэвалюцыйнай Заходне-беларускай сялянска-работніцкай грамады, глядзеў яшчэ на свет і вачамі юнака-рамантыка, якога на нялёгкі шлях змагання бласлаўлялі і імя дзявочае Вера, і яе вялікасць – вера ў бацькоўскі край, у свой народ.”.

Пра той час, пра сябе і сваё пакаленне пазней паэт напіша:

Маладосць ты мая...
Ты ішла праз штыкі
Паліцэйскіх кардонаў.
Не зламалі такіх —
Кропля я ў тых мільёнаў.



Мінула гадавіна, як не стала старэйшага беларускага паэта Анатоля Іверса (Івана Дарафеевіча Міско). Памёр паэт 26 кастрычніка 1999 года.

У 1935 годзе Іван Міско служыў у польскай кавалерыі ў Плоцку, калі ў лісце бацька напісаў, што пад коламі легкавога аўтамабіля загінула яго маці.

Пасля службы паэт вяртаецца на бацькоўскі хутар, хутка жэніцца і жыве на гаспадарцы з маладой жонкай і бацькам. Тут жа ён дачакаўся сваёй першай кніжкі “Песні на загонах”, якая паспела пабачыць свет у Вільні незадоўга да пачатку другой сусветнай вайны.

Калі прыйшлі “першыя саветы” і ў Слоніме пачала выдавацца спачатку павятовая, а потым раённая газета “Вольная праца”, Анатоля Іверса запрасіў працаваць літсупрацоўнікам рэдакцыі першы рэдактар газеты І.А.Чарняўскі.

Там Іван Дарафеевіч працаваў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У 1940 годзе стаў сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

У гады вайны хутар Міско нейкі час быў месцам збору хлопцаў і дзяўчат, якія неўзабаве станавіліся падпольшчыкамі, партызанамі, сувязнымі...

Аднойчы ў слонімскі СД паступіў данос ад мясцовага бургамістра на бацьку паэта. У ім паведамлялася, што адзін сын Міско, Максім, “знаходзіцца ў партызанскай бандзе”, а другі, Іван Міско, “у час бальшавіцкай улады быў рэдактарам слонімскай бальшавіцкай газеты”. У лістападзе 1943 года немцы схапілі жонку паэта, а ў пачатку 1944 года – бацьку. Іх вывезлі ў Калдычаўскі лагер смерці і расстралялі.

Да канца вайны Анатоль Іверс узначальваў Слонімскую падпольную антыфашысцкую арганізацыю і быў намеснікам камандзіра партызанскага атрада імя Дзяржынскага.

Пра падзеі тых далёкіх гадоў барацьбы з ворагам паэт расказаў у сваім зборніку “Я пайшоў бы ўслед за летам”.

Вайна прайшла праз сэрца і душу ветэрана. Іван Міско страціў жонку і бацьку, сам быў на валаску ад гібелі. Але, не гледзячы на ўсе яго заслугі, для савецкай улады паэт Анатоль Іверс заставаўся чужым. З 1949 па 1965 гады, замест творчай працы, паэт працуе спачатку майстрам на смолазаводзе, а потым тэхнолагам лесахімічнага завода. Не ўдалося ўладкавацца нават у рэдакцыю раённай газеты. А першы пасляваенны зборнік вершаў выйшаў толькі ў 1970 годзе.

У вершы “Мо апошні юбілей” Іверс піша:

Дэфензіву пераэжыў,
Пераэжыў гестапа.
Мо матляўся б на крыжы,
Каб папаўся ў лапы.
Але знішчылі яны
Родных перад гэтым...
Пасля страшнае вайны
Зноў прыйшлі Саветы.
Я для іх — ні брат, ні сват,
Яшчэ “без даверу”.
Лезлі ў вочы, як аса,
Выгналі за дзверы.

Паэт заўсёды жыў марамі і спадзяваннямі свайго народа. Ён усё жыццё пакутаваў за тых, хто не вярнуўся з польскіх турмаў, з нямецкіх канцлагераў, з сталінскіх ГУЛАГаў. Усё перажытае знайшло адлюстраванне ў вершах паэта. Як ні цяжка складваўся жыццёвы лёс, Анатоль Іверс найперш заставаўся паэтам. І ў творчасці ён служыў свайму народу, сваёй Бацькаўшчыне гэтак жа самааддана, як і ў жыцці.

“Я тры рэжымы пераэжыў:
Быў пан, быў гітлерац,
“таварыш”.
І памяць кажа: беражы,
Каго яны закатавалі.
Палегла многа без віны
За мову родную ў змаганні.
А голас іх дасюль звініць
На гістарычным скрыжаванні,”

– сказаў Анатоль Іверс у вершы “На Дзяды”, напісаным у апошнія гады жыцця. Паэт як бы падводзіць вынік перажытага. І, азіраючыся на лёс свайго пакалення, сцвярджае, што “...голас іх дасюль звініць на гістарычным скрыжаванні”. А значыць, пакуты і барацьба былі не дарэмнымі.

25 лістапада 2000 года ў Слонімскім доме афіцэраў адбылася вечарына памяці Анатоля Іверса. Многа цёплых слоў прагучала ва ўспамінах людзей, якія добра ведалі ці сябравалі з паэтам. Але і Данута Бічэль-Загнетава, і Алена Руцкая, і Іван Сяргейчык, і іншыя адзначалі адну вельмі характэрную якасць гэтага чалавека – яго незвычайную дабрыню і светласць душы.

Песні на словы Анатоля Іверса цудоўна выконвалі слонімскі кампазітар Мар'ян Маркушэўскі і спявачка Таццяна Пузлоўская.

А пра паэзію Анатоля Іверса, на мой погляд, вельмі трапна сказаў калісьці Мікола Арочка: “Анатоль Іверс у сваіх вершах заўсёды думае аб зямлі, аб мове, аб сваім прызначэнні і земляках, паэзія яго напоўненая і шчырая, як народныя песні.”.

Іван КАРПОВІЧ,
выкладчык беларускай мовы і літаратуры, выдатнік асветы Рэспублікі Беларусь

СПАДЧЫНА

Кандрат ЛЕЙКА
(1860 — 1921)

Мінула 140 гадоў, калі на Слонімшчыне ў вёсцы Збочна нарадзіўся Кандрат Фёдаравіч Лейка, пісьменнік і педагог. Вучыўся ў Азярніцкім вучылішчы, а затым у Свіслацкай настаўніцкай семінарыі. Пачаў працаваць настаўнікам у Косаве. Тут у 1883 годзе пачаў пісаць беларускія вершы. Ён быў сучаснікам Ф. Багушэвіча. У 1884 годзе К. Лейка па рэкамендацыі доктара пераязджае на Украіну. У яго вельмі балелі ногі. Працаваў у розных школах Харкаўскай губерні і ў Харкаве ў вучылішчы для сялянскіх дзяцей.

У пачатку XX ст. стала супрацоўнічаў з беларускімі выдавецтвамі. У “Нашай ніве”, “Нашай думцы”, “Беларускім календары”, “Велікодная пісанцы” надрукаваў 14 твораў на беларускай мове. Пра яго Максім Гарэцкі пісаў: “Надта здольны нашаніўскі апавядальнік”. У 1914 годзе па прапанове Я. Купалы рабілася спроба выдаць зборнік твораў К. Лейкі, які падабраў творы і прасіў “не мяняць слоў, бо я стараўся пісаць іх так, як гавораць каля Слоніма, дзе беларуская мова лічыцца самаю чыстаю...” Свой драматычны твор “Снатворны мак” К. Лейка прысвяціў вясковым дзецям Слонімшчыны. Свайму першаму настаўніку ў Азярніцы ён прысвяціў твор “Падзвіжнік народнай школы”. Адна гераіня яго апавядання “Таклюся-сухотніца” пытаецца:

“1. Калі паміж людзьмі будзе праўда?

2. Ці дадуць калі-небудзь беднякам зямлі?

3. Калі ўсім людзям дазволена будзе вучыцца і маліцца на сваёй роднай мове?”

У 1918 годзе К. Лейка быў паралізаваны, перавезены да брата Івана ў горад Здалбунаў, што на Украіне, разлучаны дзяржаўнай мяжой са сваім адзіным сынам Віталём.

Памёр К. Лейка ў 1921 годзе і пахаваны ў Здалбунаве.

Школьны літаратурны музей СШ №7 пры дапамозе пляменніка К. Лейкі Уладзіміра Іванавіча адшукаў неапублікаваныя творы К. Лейкі. Частка іх ужо надрукавана.

Мікалай СІДАРОВІЧ

Вершы Кандрата Лейкі для дзяцей

Над калыскаю

Ой, люлячкі, люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на варотах
Ды ў чырвоных ботах,
Сталі сакатаці.
Трэ есці даці:
Адной піражка,
Другой тваражка,
А трэцяй гарошку,
Каб бавіла Зоську.

Ядзерац

Ляці туды, ядзерац,
Скуль мой будзе маладзец.
Як паляціш, то пушчу,
Не паляціш — утаплю.

Рабко

Рабко верна ў нас служыць
І жыве сабе, не тужыць:
Удзень грэецца на сонцы,
Ноччу дрэмле на саломцы.
Пільнуе ён гумно, садок,
З двара не ступіць
ні на крок, —
Але тады толькі брахне,
Як хто ў бок нагой штурхне.
1886 г.

Леанід МІКАЛАЙЧЫК

Ці сустрэнемся...

Ці сустрэнемся больш
мы з табою,
Сінявокая радасць мая?
Усё гадаю, якою парою
Мне пакажацца постаць твая.
Можа летам гарачым на полі,
Як збіраць будзеш ты васількі,
Тваю песню пачую аб долі,
Што ўдзялілі Радзіме вякі.
Можа восенню хмурай,
тужлівай,
Як засцеле прасторы імгла,
Як прамокну я
ночкай дажджлівай,
Ты паклічаш мяне да стала.
Можа ўзімку мне
ўдасца адзначыць
Навагоднія свята з табой
І на вуснах усмешку пабачыць,
І не знаіца ўжо
болей з тугой.
Эх, вясною хацеў бы сустрэцца,
Як навокал жыццё так бурліць,
Каб навек на цябе наглядзецца
І навекі з табою каб быць.
Я так прагну
сустрэцца з табою,
Сінявокая радасць мая.
То скажы ж ты, якою парою
Мне пакажацца постаць твая?

У альбом

(Трыялет)

Не пакахаць цябе не зможа,
Хто юны сэрцам і душой,
Хто бачыўся хоць раз з табой,
Не пакахаць цябе не зможа.
Як розумам, так і красой
Чаруеш ты усіх прыгожа.
Не пакахаць цябе не зможа,
Хто юны сэрцам і душой.

Алена РЖЭУСКАЯ

Прысвячаецца Ганне Т.

Ёсць у восені штосьці
з маленства
І ад сталасці штосьці у ёй.
Такое яе падабенства
Мо хаваецца ў думцы маёй?
Лашчыць сонейка ціхую восень,
Ліст кляновы плыве па вадзе,
І нябёсаў глыбокую просінь
Клічуць ў вырай буслы
ўсё радзей.
Нетаропкія сталасці крокі, —
Усё адносна
у гэтым жыцці —
А дзяўчынцы праз
тыя ж урокі
Побач з дзедам
і бацькам ісці.
Цішыня... Цішыня... І аблокі,
Нібы гускі, ляцяць
ў далячынь,
Шоргат лісця абапал дарогі
Зноў абудзіць няясны ўспамін.



☺ 😐 ☹

Лекция по физике. Лектор рассказывает о радиации:

- Вот вы тут говорите: "радиация, радиация...", а между прочим, многие моряки годами не вылезают из атомных подводных лодок, а их жены тем временем рожают совершенно нормальных детей!

☺ 😐 ☹

Около ранчо остановилось стадо баранов и уставилось на ворота.

- Чего они смотрят? - спросили у пастуха. - Ведь ворота старые?

- Бараны новые, - ответил пастух.

☺ 😐 ☹

- Были коммунисты - была дешевая колбаса. Пришли демократы - пропала дешевая колбаса. Но вернутся коммунисты - опять будет дешевая колбаса!!!

- Я не понял. Они что ее тудасюда с собой таскают?

☺ 😐 ☹

Судья спрашивает свидетельницу:

- Вы замужем?

Та тяжело вздохнула. Судья - секретарю:

- Пишите: "Не замужем".

Потом он свидетеля спрашивает:

- Вы женаты?

Мужик тоже тяжело вздохнул. Судья секретаю:

- Пишите: "Женат".

☺ 😐 ☹

Мужчина жалуется знакомому:

- Мои соседи невыносимы: вчера всю ночь до рассвета колотили в стену!

- Бедняга, тебе не дали поспать!

- Ну, сказать по правде, я все равно не спал - репетировал соло на тромбоне.

☺ 😐 ☹

Сын говорит отцу:

- Папа, знаешь, какое чудесное представление было сегодня в цирке? Там наездник сначала прыгнул на ходу лошади ей на спину, потом проскользнул под животом, уцепился за хвост и закончил это тем, что вскочил ей на шею задом наперед.

- Ну и что тут особенного? Я тоже все это проделал, когда в первый раз сел на лошадь...

☺ 😐 ☹

Пьяный мужчина идет по улице. Поскальзывается, падает, ощупывает мягкое место и с ужасом шепчет:

- Разбил, расколол, пополам!

☺ 😐 ☹

Джон был при смерти и тяжело дышал. Собрав остатки сил, он обратился к жене:

- Выполнишь ли ты мою последнюю просьбу?

- Конечно, Джон, - тихо ответила она.

- Я хочу, чтобы через 6 месяцев после моей смерти ты вышла замуж за Джо...

- Но я полагала, что ты его ненавидишь?

На последнем дыхании Джон вымолвил:

- Ещё как ненавижу..

☺ 😐 ☹

Крысы предупредили капитана корабля, что у них учебная тревога.

☺ 😐 ☹

В сберкассу заходит мужчина и просит снять с книжки большую сумму денег:

- Прикупили что-нибудь? - участливо спрашивает кассирша.

- Да. - сердито отвечает он. - Два туза на мизере.

☺ 😐 ☹

Приехал мужик в гостинницу, а ему говорят - мест нет, есть одно, но там сосед храпит так, что всю ночь спать не будете.

Мужик подумал и говорит: "Пойдёт".

На следующее утро:

-Ну, как спали?

-Нормально.

-???

-А я к нему вечером подошёл, сказал: "Спокойной ночи, милый." - и поцеловал. Так он после этого не только ни разу не захрапел - всю ночь глаз не сомкнул!!!

это интересно

УМНО ПОКАЗАТЬ — ВЕСОМО СКАЗАТЬ!

Предстояло принятие великого композитора Людвига ван Бетховена в действительные члены Академии искусств в Париже.

Председательствующий объявил: "Мы собрались сегодня для того, чтобы принять в члены нашей академии великого Бетховена". И тут же добавил, что, к сожалению, ни одного вакантного места в академии нет, тем, как бы, предрешив исход дела.

В зале воцарилось молчание.

— Но, — продолжал председатель... и налил из стоящего на столе графина полный стакан воды, так что ни одной капли добавить нельзя было; затем оторвал из стоящего тут же букета один лепесток розы и осторожно опустил его на водную поверхность. Лепесток не переполнил стакана, и вода не пролилась. Тогда Председатель, не сказав ни слова, обратил свой взор к собравшимся. В ответ последовал взрыв аплодисментов. На этом и закончилось заседание, единогласно избравшее Бетховена действительным членом Академии искусств.


невыдуманные истории

Экзамен

Был такой персонаж в наше время — Фил. Один из самых упорных НЕУЧИВШИХСЯ на мехмате. А надо сказать, что истинный НЕУЧАЩИЙСЯ не только на лекции не ходит, но и в сессию ничего выучить не пытается — разве что в метро по дороге на экзамен книжку полистает. Так Фил даже этого не делал. И шпорами не пользовался — исключительно "бомбами" (это написанный уже на большом листе ответ на вопрос) — лень было со шпоры на экзамене переписывать. Бомбы, естественно, тоже не сам писал. — добрые люди за ненадобностью отдавали.

Естественно, в зачетке у Фила других отметок, кроме как "удовлетворительно" в жизни не появлялось. Но однажды Фил получил "ОТЛИЧНО"! Случилось это так. Фил пришел сдавать (что-то по топологии) вместе со всеми — другая группа уже отстрелялась, и бомбы у него уже были. И попал Фил к профессору А-му, который курс не читал и занятия не вел, так что всех, а не только Фила, видел в первый раз и свойств Филовых не знал. И вот Фил громко и с выражением читает свои бомбы — так удачно сложилось, что на оба вопроса были. Профессору А-му лень копаться в знаниях каждого студента, много их сегодня, потому он, ежели глупостей откровенных не говорят, дополнительных вопросов по билету и не задает. Отбарабанил Фил теорию, профессор А-ий ему задачку дает. Рисует несколько точек и просит доказать что-то про них. Понятно, слов таких, какие профессор А-ий произнес, Фил в жизни не слышал, да и не интересно ему: теорию-то ответил, нельзя ж два балла теперь влепить. Сидит Фил, ждет, пока профессор А-ий к нему за решением подойдет, хмыкнет и спросит: "Тройка устраивает?". Скучно Филу. Стал он от нечего делать точки нарисованные кружочками обводить. И вот подходит профессор А-ий: "Ну, как Ваши дела?" "Нууууу..." — говорит Фил, желая, чтобы эта бодяга скорее кончилась, и пустой листок профессору А-му протягивает. Смотрит профессор А-ий на Филовы кружочки, лицом светлеет, и говорит: "О! Правильно! Берем непересекающуюся систему окрестностей, далее все очевидно! Зачетку давайте!"


ОТВЕТЫ НА кроссворд (№44)



СЛОВО-пароль: *сова*

кроссворд

Составил Владимир ВАШУТА



По горизонтали

6. Орган растения, в котором развиваются споры.
7. Надежная защита, опора.
9. Единица ускорения.
10. Стебли и листья корнеплодных растений.
14. Вулкан на острове Кюсю в Японии.
15. Венгерский композитор, автор оперетты "Королева Чардаша".
16. Грунт под водой водоема.
19. Порода скороспелых яйценоских кур.
20. Бог брака в древнегреческой мифологии.
22. Город в Ираке.
23. Химический элемент.
24. Закон, указ.
27. Водное пространство между материками.
28. Древнеримская медная монета.
29. Высокое узкое архитектурное сооружение.
32. Вид спорта.

По вертикали

1. Костяк, каркас.
2. Отдельная книга издания.
3. Вулканическая горная порода темного цвета.
4. Угнетающая, порабощающая сила.
5. Город в США, в штате Западная Виргиния.
8. Русский поэт XX века.
11. Русский советский поэт.
13. Писатель, автор романа "Цыган".
17. Зажиточный крестьянин в современной турецкой деревне.
18. Одноконный экипаж в Англии.
21. Парламент в Израиле.
25. Насыпь для задержания воды при разливе.
26. Щит, на котором при помощи светового сигнала передается какая-нибудь информация.
30. Стержень, на котором держатся колеса, вращающиеся части механизма.
31. Крупная река в России.

ГОРОСКОП

ОТ WWW.IGNIO.COM

НА НЕДЕЛЮ



ОВЕН

Наступает достаточно сложный и ответственный период, которому может сопутствовать некоторое внутреннее напряжению. Для достижения успеха в Ваших трудах понадобится сила воли, сосредоточенность и душевное равновесие. Общение с друзьями подарит Вам немало приятных минут и массу интересной и полезной информации.



ТЕЛЕЦ

В некоторых вопросах по работе Вам будет нелегко придти к общему мнению с коллегами. Постарайтесь объективно оценить создавшуюся ситуацию. Отодвиньте тревожность в сторону, отбросьте страхи, и Вы увидите реальный выход из сложившегося положения, он позволит Вам добиться незапланированного успеха.



БЛИЗНЕЦЫ

Наступает интересное время, богатое разнообразными событиями. Работы — непочатый край, где есть место и для творчества, и для реализации новых и старых идей. Результаты будут прямо пропорционально зависеть от затраченных сил, вдохновения и добросовестности. Изобретайте и воплощайте идеи в реальность.




РАК

Постарайтесь не замыкаться в себе и не превращаться в рака-отшельника. Общение Вам необходимо, пусть даже самое минимальное. Ваша идея, воплощенная в реальность, начнет приносить плоды. Вы можете открыть для себя новые творческие аспекты, но учтите, что для этого необходима тишина и комфортная обстановка.




ЛЕВ

Если Вы не попадались в лапы к госпоже лени, то отвечать за недоделанную работу Вам не придется. Нагрузка на работе будет постепенно нарастать. Только не взваливайте на себя все, выбирайте объем работы по своим силам.




ДЕВА

Неделя будет благоприятна для завершения накопившихся дел. Проявите свойственную Вам добросовестность и пунктуальность, обратите пристальное внимание на мелочи, и Вам не придется исправлять свои ошибки, их просто не будет. Постарайтесь меньше критиковать коллег по работе, помните, молчание - золото, они и так все поймут.



ВЕСЫ

Жизнь полна неожиданностей и разнообразных событий. Вас будут окружать либо тайны, либо сплетни. На них не стоит обращать внимание, лучше заняться творческой работой. Не берите на себя невыполнимые обязательства, иначе сложно будет выпутываться из сложившейся ситуации. Постарайтесь не переусердствовать с эмоциональными выплесками, смотрите, чтобы от этого никто не пострадал.



СКОРПИОН

Забудьте о своих обидах, скиньте этот груз, и Вы почувствуете себя окрыленным. Не время рисковать и впутываться в авантюрные истории. Лучше наладить отношения с родственниками, исправив возникшие недоразумения во взаимопонимании. Невыполненные дела взывают к их завершению, постарайтесь справиться с ними.




СТРЕЛЕЦ

Ситуация, которая сложится на этой неделе, может спровоцировать Вас на спор с коллегами по работе, постарайтесь философски отнестись к нему и превратить его в увлекательную беседу, это Вам по силам. Вам просто необходимы плодотворные встречи с друзьями и активный отдых. Следите за своей речью, нечаянно оброненное слово может быть с успехом использовано Вашим недоброжелателем.




КОЗЕРОГ

Ваша задача на эту неделю - добросовестно выполнять свою работу, деловой хватки и способностей Вам не занимать. Не будьте излишне любопытным, постарайтесь спокойно отнестись к тайнам на работе, этому будет способствовать погруженность и сосредоточенность на главном. Ваша работоспособность повысится, воспользуйтесь этим.



ВОДОЛЕЙ

Вы производите благоприятное впечатление на окружающих, им кажется, что Вы можете все, но никто не догадывается, как трудно Вам это дается. Доверяйте своей интуиции, она подскажет Вам правильное решение, которое так Вам необходимо. Реально рассчитывайте свои силы, не доводите себя излишней нагрузкой до нервного срыва.



РЫБЫ

Прекрасное время для карьерного роста и продуктивных начинаний, способствующих раскрытию Вашего творческого потенциала. Желательно не конфликтовать с начальством, а пойти на разумный компромисс. Плывя против течения, Вы можете потратить много сил и прийти к нулевому результату.

Спявае Міхась Забэйда-Суміцкі

Міхась Забэйда-Суміцкі (1900-1981) — славуты беларускі спявак, геніяльны тэнар, які выступаў у найпрэстыжнейшых канцэртных залах свету.

Спявак нарадзіўся ў вёсцы Шэйпічы Пружанскага раёна. Скончыў Маладзечанскую семінарыю, а пасля вакальную падрыхтоўку атрымаў у Харбінскай оперы і ў Мілане. Ён выступаў у славутым італьянскім тэатры "La Skala", быў знаёмы з Сабінавым, з Фернандам Карпі і з іншымі вялікімі спевакамі свету.

Міхась Забэйда-Суміцкі ў свой час не згадзіўся прыняць савецкае грамадзянства, ён марыў пра незалежную Беларусь, якую моцна любіў. Усё жыццё ён пражыў за мяжою і толькі падчас хрушчоўскай адлігі, у 1963 годзе, яму дазволілі выступаць з канцэртамі ў Беларусі. Спявак прыехаў на Радзіму. Ён выступаў у Мінску, Гродне, Ваўкавыску, Слоніме, Баранавічах, Лідзе і ў іншых гарадах Беларусі. Спяваў беларускія народныя песні, песні на словы Я.Купалы, А. Русака, П.Труса. Гэта былі канцэрты-аншлагі.



На жаль, больш нашаму славутаму тэнару выступіць на Радзіме не дазволілі. Апошнія гады жыцця Міхась Забэйда-Суміцкі пражываў у Празе, дзе і памёр у 1981 годзе.

За мяжою ў яго выйшла шмат пласцінак і дыскаў з песнямі на 20 мовах свету. А ў Беларусі ў пасляваенныя гады песні нашага земляка не выдаваліся. І вось нядаўна выйшла першая касета песень Міхася Забэйды-Суміцкага "Ластаўкі ў стрэсе". Назву ёй падказаў ёмісты вобраз адной з размешчаных тут народных песень. Мы, беларусы, павінны нарэшце сабраць і асэнсаваць той вялікі музычны скарб нашага земляка. Дарэчы, касету беларускіх песень Міхася Забэйды-Суміцкага можна купіць і слонімцам у магазіне "Румб", што на Чырвонаармейскай вуліцы, 18.

Сяргей ЧЫГРЫН

ГОМЕОПАТИЯ И МЫ ®

Теория и практика гомеопатии могут показаться странными тому, кто привык иметь дело с традиционной химической медициной. Доктор Самуил Ганеманн, основавший в XIX веке гомеопатию, считал, что медикаменты, которые в больших дозах могли вызывать возникновение целого ряда симптомов, в малых дозах — подчас настолько малых, что не остается и молекулы исходного вещества, — могут устранять те же симптомы.

Но если методы гомеопатии кажутся невероятными, это еще не значит, что ими нельзя пользоваться. Мы с надеждой ищем средства от хронических заболеваний, которым подвержены многие из нас, и в своих поисках отходим от достижений традиционной медицины.

Нам нужны лекарства, обладающие минимальным побочным действием. И мы считаем правильными системы лечения, рассматривающие отдельные симптомы как части целого, которые делают основной упор на стимуляцию собственных защитных сил организма, а не пытаются атаковать ее врагов. Гомеопатия работает с нами, а не над нами.

Гомеопатия — та регулирующая терапия, цель которой — воздействие на процессы саморегуляции с помощью лекарств, подобранных строго индивидуально, с учетом реакции больного.

Первым и основным принципом гомеопатии является "закон подобия", заключающийся в том, что лекарственные средства в малых дозах эффективны при тех же заболеваниях, которые вызывают данные вещества в больших дозах. А второй принцип заключается в необходимости испытывать предполагаемые гомеопатические препараты в больших дозах на здоровых людях. Насколько реальна проверка на здоровых, можно видеть из повседневного опыта. Каждый испытывал действие лука на себе при его очистке и шинковке: слезотечение, першение, чихание. Раздражающее действие лука на слизистую оболочку носа и глаз — точный опыт. Также достоверно, что катаральный насморк сопровождается подобным раздражением глаз и носовых проходов. Мы испытали Allium сера (лук) — средство для лечения насморка.

Гомеопатические лекарства получают из натурального сырья: растений, животных и минералов. Ганеманн разработал специальную технику обработки сырья путем растирания, разведения, благодаря которой достигается постепенное уменьшение дозы и одновременное извлечение действующего начала с повышением его активности. Полученная таким образом лекарственная форма обладает оптимальным лечебным свойством при отсутствии побочного действия. При смешивании этой лекарственной формы с веществом - носителем (вода, алкоголь, молочный сахар) мы получаем гомеопатический препарат.

В современной медицине существует множество форм гомеопатических препаратов: это традиционные горошины из молочного сахара — "крупинки", это таблетки, это спиртовые растворы — капли, инъекции, мази и спреи.

Природа настолько разнообразна, насколько индивидуален каждый человек. В гомеопатии существуют лекарства для детей и стариков, для мужчин и женщин, для полных и худых, для брюнетов и блондинов, для рыжих и лысых, для добрых и злых, для плаксивых и упрямых, одним словом, для всех. Есть препараты, помогающие пережить последствия перенесенного горя, утраты и препараты, стимулирующие память, повышающие иммунитет, работоспособность человека.

Основополагающий принцип медицины всех времен и народов — лечить не болезнь, а больного, находит воплощение в гомеопатических канонах.

Часто спрашивают: "Гомеопаты — это фитотерапевты или шарлатаны?". Нет. Гомеопатами могут стать только врачи с определенным стажем практической работы, прошедшие специальную подготовку.

В республике работает несколько гомеопатических центров, многие врачи практикуют гомеопатию в поликлиниках.

Я приглашаю всех, прочитавших эту статью, попробовать на себе этот эффективный и безопасный, а главное дешевый научный метод терапии острых и хронических болезней.

Тамара БУСЬКО,
врач-гомеопат, член Белорусского гомеопатического общества

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

Мой радавод: лёс сям'і ў XX стагоддзі

Грамадскае аб'яднанне "Дыярыуш" пры ўдзеле Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, Таварыства беларускай школы і Згуртавання Беларускай Шляхты абвяшчае конкурс "Мой радавод: лёс сям'і ў XX стагоддзі".

У конкурсе могуць браць удзел вучні сярэдніх навучальных установ (пачынаючы з 7-га класа): ліцэяў, гімназій, а таксама навучэнцы каледжаў, ПТВ, тэхнікумаў.

Форма конкурснай працы адвольная: сачыненне, эсэ, інтэрв'ю, калаж з фотаздымкаў, фільм і інш. Калі праца не тэкставая (аўдыё-, відэа-, фотаздымкі) — да яе павінна быць далучана пісьмовая частка, якая адлюстроўвае працэс даследавання альбо заключае каментарый да крыніцаў.

Працу пажадана пісаць на беларускай мове, яе можна выконваць індывідуальна альбо групай, самастойна альбо з дапамогай куратара.

Да працы абавязкова павінна быць далучана анкета ўдзельніка з прозвішчам, імем удзельніка, яго каардынатамі і назвай працы, а таксама з прозвішчам, імем і каардынатамі кіраўніка (пры яго наяўнасці).

Працу трэба дасылаць у адным асобніку да 1 траўня 2001 г. (дата вызначаецца па паштовым штэмпелі) на адрас: "Блізкая гісторыя", а/с 128, 220064, Мінск.

Вынікі конкурсу будуць абвешчаныя 8 ліпеня 2001 г.

Усю патрэбную інфармацыю, парады і брашуру, у якой падрабязна выкладзены ўмовы конкурсу, можна атрымаць ад сакратара конкурсу Ірыны Коваль (па тэлефоне **(8-017) 227-51-09**, па пошце: **"Блізкая гісторыя", а/с 128, 220064, г. Мінск**).

Жадаем поспехаў!

конкурс для школьнікаў конкурс для школьнікаў конкурс для школьнікаў конкурс для школьнікаў

Газета Слонімская
2 — 8 лістапада 2000 г., № 45 (178)

Дорогие
Тарас ЛАРИОНОВ и Светлана КУПИЧ!
От всей души поздравляем вас с днём бракосочетания!



Молодожёнов поздравляем,
Любви и счастья им желаем.
Мужу — слушаться жену
И любить её одну,
А жене — рожать детишек,
Милых, славных шалунишек!
Ждём от вас богатырей
И красавиц дочерей.
А ещё мы вам желаем
Молодыми вечно быть,
Нас на свадьбу золотую
Не забудьте пригласить!



С уважением и искренними пожеланиями сестра Наташа и брат Рома

Дорогие и любимые наши
Иван Алексеевич и Ирина Ивановна ЖИВУЛЬКО!
От всего сердца поздравляем вас с 25-летием совместной жизни!
Желаем вам крепкого здоровья, счастья, успехов.

Двадцать пять — окиньте взглядом,
Пролетевших, словно миг.
Двадцать пять — прошли Вы рядом,
Всё делили на двоих:
Жизни праздники и будни,
Свет улыбок, груз забот.
Пусть для Вас счастливым будет
Каждый день и каждый год.



С любовью и уважением ваши дочери Татьяна и Наталья, зятья Александр и Дмитрий, внучка Екатерина

Дорогая, милая, родная жена, мамочка, сестрёнка, доченька
Оксана Анатольевна ЮНДЕЛЬ!
От всей души поздравляем с днём рождения!

Аромат всех цветов
И румянец зари
Мы готовы тебе
В этот день подарить.
Всё, что светлого есть
И большого в судьбе,
Мы от чистого сердца
Желаем тебе.

С любовью муж, дети, брат и мама

Дорогая, любимая внучка и племянница
Оксана Анатольевна ЮНДЕЛЬ!
С днём рождением тебя, дорогая!

Будь всегда хорошей,
Будь всегда красивой,
Будь всегда весёлой,
Славной, доброй, милой.

Бабушка Мария, крёстный Вася

Дорогая и любимая крёстная
Галина Михайловна САВАНЧУК!
От всей души поздравляем Вас с днём рождения.



Желаем удачи,
Тепла и добра.
Чтоб все неудачи
Сгорели дотла!
Чтоб жить — не тужить
До ста лет довелось,
Пусть сбудется то,
Что ещё не сбылось.

Любящие Вас Оля и Лена

Дорогой
Александр Анатольевич ТУРЛАЙ!
Поздравляю тебя с днем рождения!

Желаю счастья, светлых дней,
Здоровья, что всего ценней,
Дороги в жизни подлинней
И больше радости на ней.



Крестная

Уважаемый
Сергей Михайлович РОДЕВИЧ!
Поздравляем с 70-летием!

С юбилеем тебя поздравляем
И желаем всем сердцем тебе:
Сил, здоровья, любви, уваженья
